Звязда
Падарожжа праз 100-годдзе

# ЯК МЫ ПІСАЛІ ГІСТОРЫЮ (1917 — 1927)

**Юбілей — не толькі выдатная нагода склікаць сяброў і блізкіх на свята, але і час падвесці пэўныя вынікі, падлічыць не толькі свае гады, але таксама поспехі і пралікі, азірнуцца на ўжо зробленае і пражытае. Тым больш, калі пражыта ні многа ні мала — цэлае стагоддзе!**

**«Адгартаць» назад 100 гадоў не так проста, як падаецца на першы погляд, але мы вырашылі ўсё ж паспрабаваць зрабіць гэта з дапамогай соцень і тысяч старых нумароў «Звязды». Сведкі веку — пажаўцелыя газетныя старонкі — прапануюць уважліваму чытачу не толькі афіцыйную гістарычную хроніку (урэшце, для гэтага ёсць падручнікі), але ў кожнай публікацыі расказваюць пра розныя этапы жыцця Беларусі — савецкай, акупаванай, партызанскай, незалежнай... Такім чынам, напярэдадні стогадовага юбілею «Звязда» распачынае новы маштабны праект «Падарожжа праз стагоддзе», у якім за некалькі адрэзкаў — дзесяцігоддзяў з 1917-га да 2017-га мы ўзгадаем пра форму і змест, тэмы і герояў, а таксама аўтараў публікацый нашай газеты.**

## АД «ЗВЕЗДЫ» ДА «ЗЬВЯЗДЫ»

...На жаль, самых першых падшывак рэвалюцыйнага 1917-га не захавалася не тое што ў архівах рэдакцыі, якая на пачатку свайго існавання вымушана была вельмі часта мяняць «яўкі»-адрасы, але нават у зборы Нацыянальнай бібліятэкі. Чаму так? Адказ далі ўласна журналісты той, ранейшай, «Звезды» (амаль 10 год газета насіла менавіта такую назву і выдавалася да 1925 года толькі на рускай мове).

У нумары ад 16 студзеня 1919 года адразу звяртаю ўвагу на перадавіцу «На старом пепелище»:

*«Партийный орган Белоруссии и западного фронта — «Звезда» — снова возрождается на месте своего первоначального возникновения.*

*Судьбы нашей газеты тесно связаны с судьбами и ходом революции в нашем крае. Вот она — полулегальный, почти подпольный листок, преследуемый правительством Керенского, постоянно закрываемый, меняющий названия (некаторы час у 1917-м газета выходзіла пад назвамі «Молот» і «Буревестник». — **Аўт.**) — и всё же жадно читаемый солдатской массой. Это было время, когда наша партия, возглавлявшая возрастающий пролетариат и революционный фронт, впервые выходила на арену политической борьбы...*

*Далее «Звезда» выходит под своим первоначальным названием и в качестве партийного органа Минского комитета — время, наступившее после ноябрьского переворота, когда начиналось строительство советского государства.*

*Но вскоре «Звезда» временно прекратила своё существование. Для Советской России наступил период сильных потрясений, период немецкого нашествия и Брестского мира. ...Принуждённая бежать из Минска, «Звезда» снова начинает выходить в Смоленске, где и продолжает быть душой нашей партии и одухотворять совершаемую вокруг революцию...»*



«Звезда» ў 1919-м.

Зразумела, што ва ўмовах штодзённага выжывання не выпадала і гаварыць пра тое, каб весці акуратны газетны архіў, які захаваў бы для гісторыі і нашчадкаў і найбольш яркія, і паўсядзённыя публікацыі. Пра што яны былі, здагадацца нескладана — дастаткова пагартаць падручнікі па гісторыі Беларусі пачатку XX стагоддзя... Напрыклад, «Звезда» рэгулярна, практычна штодзённа, адсочвала сітуацыю на фронце: так, у студзені 1919-га газета паведаміла чытачам, што «украинскими советскими войсками взят Чернигов», а з іншага боку чырвонаармейскія злучэнні падцягнуліся «к Ковелю, Гродно и Белостоку». Не менш увагі надавалася і падзеям на міжнароднай палітычнай арэне: у рубрыцы «Тэлеграма» друкаваліся свежыя навіны як з Расіі, так і з Латвіі, Літвы, Аўстрыі, Італіі, Швецыі... І, канешне, найважнейшыя падзеі ў БССР — уласна заснаванне новай савецкай рэспублікі і прыняцце яе першай Канстытуцыі, выхад са складу РСФСР, аб'яднанне з Літоўскай савецкай рэспублікай і ліквідацыя Літбела, уваход у склад СССР, савецка-польская вайна, далучэнне Заходняй Беларусі і г.д. — усё гэта займала цэнтральнае месца на газетных старонках.

Зрэшты, пераказваць з дапамогай даўніх артыкулаў тыя самыя падручнікі па гісторыі — справа няўдзячная і бессэнсоўная, таму давайце засяродзімся лепш на звычайным, паўсядзённым жыцці, якое не спынялася ў віхуры разбурэння старога, капіталістычнага, і будаўніцтва новага, рабоча-сялянскага свету. Падтрымка няўстойлівай эканомікі і тым больш сацыяльнай сферы, барацьба з крыміналам, жыллё і транспарт, медыцына і адукацыя — усе гэтыя пытанні трэба было вырашаць неадкладна.

## ІМЕМ РЭВАЛЮЦЫІ

Напрыклад, у 1919 годзе, паводле звестак «Звезды», Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі вылучыў на *«восстановление Советской власти в крае»* 1,5 мільёна рублёў, і яшчэ 1 мільён — на развіццё Камісарыяту пошты і тэлеграфаў *«в связи с продвижением наших войск на запад»*, у той час як


Россійская Соціалъ-Демократическая Рабочая Партія.

ЗВѢЗДА

Пролетаріи всѣхъ странъ соединяйтесь!

Органъ Минскаго Комитета Р. С.-Д. Р. П.

Условія подписки:

Цѣна отдѣльнаго номера 10 коп.

№ 1. ЕЖЕДНЕВНАЯ ГАЗЕТА. № 1.

**Товарищи!**

рабочіе, солдаты и вся городская бѣднота, если вы хотите скорѣйшаго окончанія войны, ограниченія прибыли капиталистовъ, контроля рабочихъ надъ производствомъ и распредѣленіемъ, обложенія налогами купцовъ, фабрикантовъ и заводчиковъ, если вы хотите, чтобы городское хозяйство не было въ рукахъ разбойниковъ капиталистовъ и если вы не хотите, чтобы капиталисты возстановили старую позицію, то голосуйте за списокъ

№ 5. — № 5.

Россійской Соц.-Дем. Раб. Партіи, истинной защитн. трудящихся классовъ

Ко всѣмъ членамъ нашей партіи.

Товарищи!

Каждый членъ партіи долженъ стать подписчикомъ „Звѣзды".

Каждый членъ партіи долженъ организовать коллективную подписку на „Звѣзду".

Каждый изъ Васъ долженъ читать ее вслухъ другимъ товарищамъ, солдатамъ и рабочимъ и вмѣстѣ обсуждать и разъяснять ту позицію, на которой стоитъ наша газета.

**Наша газета.**

**Отъ редакціи.**

Дорогіе товарищи!

Выпуская первый номеръ нашей газеты, редакція доводитъ до свѣдѣнія товарищей читателей, что второй номеръ „Звѣзды" выйдетъ спустя 2—3 дня, т. к. имѣвшіяся затрудненія въ типографіи не даютъ возможности выпустить ее безъ перерыва.

РЕДАКЦІЯ.

**Къ товарищамъ!**

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У рэдакцыі захоўваецца копія першай старонкі першага нумара «Звязды».

Смаленскі дзяржаўны ўніверсітэт атрымаў грашовую падтрымку ўсяго ў 300 тысяч рублёў.

Тады ж для вырашэння жыллёвага пытання ў Мінску карэспандэнты «Звезды» прапанавалі стварыць камісію па перасяленні рабочых *«из нездоровых помещений в квартиры буржуазии»*: *«Необходимо выработать хотя бы приблизительную таксу, осадить домовладельцев и квартиронанимателей, склонных к спекуляции. О национализации говорить рано, но не следует игнорировать подготовку к ней»*.

Яшчэ адно найвастрэйшае і балючае пытанне таго перыяду — забеспячэнне насельніцтва харчовымі прадуктамі, а найперш — хлебам. Цэны на яго раслі з небяспечнай хуткасцю: толькі за студзень 1919 года фунт падаражэў утрая, да 3 рублёў 70 капеек. *«В данный момент все вопросы должны временно отойти на задний план и все живые силы должны быть сконцентрированы для отражения наступления царя-голода на Красный Минск*, — з трывогай зазначалі журналісты «Звезды». — *Нельзя ждать ни одной минуты. Ибо спекуляция на спекуляции едет и спекуляцией погоняет. Когда цены уже взвинчены, их трудно «осадить»*. Як меру барацьбы «Звезда» прапанавала зафіксаваць цану хлеба на ўзроўні 3 рублёў за фунт і прымусіць гандляроў адпускаць менавіта па гэтай цане — пад пагрозай пакарання па законах рэвалюцыйнага часу.

...Акрамя хлеба, у чырвоным Мінску не хапала шмат чаго — у тым ліку рабочых рук і адукаваных спецыялістаў. Нездарма гарадскі Аддзел размеркавання рабочай сілы, як вынікае з публікацый «Звезды» ў 1919—1920 гг., узмоцнена шукаў урачоў, сясцёр міласэрнасці, настаўнікаў для выкладання, у прыватнасці, польскай і рускай мовы. (Заўважым, што і амаль праз 100 гадоў у сталіцы існуе падобны кадравы голад...) Пазней, дарэчы, часовы ўрад правёў нацыяналізацыю аптэк і прыцягнуў да абавязковай адпрацоўкі для дапамогі фронту ўсіх сталічных урачоў, якіх у Мінску налічвалася... каля 120 чалавек.

«Звезда» працавала практычна ў кругласутачным рэжыме, бо мела дзве рэдакцыі — дзённую і начную (дзяжурную), друкавалася штодня, уключаючы нядзелю, і вяла самую актыўную перапіску з чытачамі. Асноўныя рубрыкі — «Деревенская жизнь», «Рабочая жизнь», «Партийная жизнь» — трэба сказаць, задавалі агульны тон у кожным нумары. Аднак у ім хапала месца і для палемічных артыкулаў, і для гарадскіх навінаў, і для эканамічных аглядаў, і для крымінальнай хронікі, і нават для культурна-асветніцкага сектара: так, ідэйныя актывісты маглі даведацца з газеты, што ў адной з цэнтральных сталічных зал таварыш Рычард Пікель чытае папулярныя лекцыі на тэму «Інтэлігенцыя і сацыялізм» або «Задачы Чырвонай арміі ў сусветнай рэвалюцыі», а звычайныя мяшчане — што ў Беларускім савецкім тэатры ідзе п'еса ў 1-й дзеі «Модны шляхцюк» Каганца.

Пра набалелае чытачы маглі выказацца і самі: у раздзеле «Почтовый ящик» рэдакцыя вяла перапіску з аўтарамі — камусьці рэдакцыя дапамагала парадай, камусьці адказвала на пытанні, кагосьці запрашала зрабіць належны ганарар, а камусьці проста казала лаканічнае «не пойдзе». У рубрыцы «Чистилище» актыўныя карэспандэнты нястомна выкрывалі недахопы на месцах, дасылалі злабадзённыя фельетоны ў фармаце «Маленьких рассказов» і нават складалі «Огоньки» — вострасацыяльныя анекдоты з сучаснага жыцця. Адны расказвалі, як у іх адмыслоўца прымацьвае «керанкі» нароўні з царскімі грашыма — нават спецыяльна прыняты дэкрэт часовага ўрада яшчэ доўга не мог вырашыць гэту праблему, другія скардзіліся, што неўтаймоўная спекуляцыя пранікла нават у шэрагі Чырвонай арміі, трэція абураліся, што ў хлебных лаўках прадаюць булачкі з белага хлеба — па 4 рублі за штучку, — і гэта пры строгай забароне рабіць выпечку з пшаніцы, якую везлі на экспарт...

## МЫ НАШ, МЫ НОВЫ...

Напачатку 1920-х, пасля канчатковага вяртання са Смаленска ў Мінск, «Звезда» засталася вернай сабе і пры ўсім накале партыйнай рыторыкі заклікала не толькі найхутчэй будаваць камуністычнае грамадства ва ўсім свеце (*«Скоро, скоро воссияет солнце свободы!»*), але і дапамагала суайчыннікам паляпшаць уласнае жыццё тут і цяпер. Вульф Нодэль, які быў адказным рэдактарам газеты ў 1921—1925 гг., узнімаў у сваіх перадавіцах самыя злабадзённыя тэмы: ад увядзення НЭПа і перадачы зямлі сялянам да неабходнасці барацьбы з татальным п'янствам і падтрымкі мацярынства і дзяцінства. Паляпшэнне ўмоў у дзіцячых дамах, якія пасля грамадзянскай вайны былі перапоўнены, і становішча працоўных жанчын наогул сталі ключавымі тэмамі «Звезды» нароўні з палітычнымі і эканамічнымі навінамі — у газеце з'явілася спецыяльная «Страничка женщины-работницы».

Працягваючы трымаць руку на пульсе падзей і пазаштатныя аўтары — рабкары з Барысава, Мазыра, Слуцка, Чэрвеня, Капыля і іншых гарадоў і вёсак. Яны вядуць рубрыку «Под колпаком «Звезды», паводле матэрыялаў якой афіцыйныя органы рэгулярна праводзяць праверкі і робяць справаздачы пра іх вынікі. А яшчэ менавіта ў гэты час інфляцыя набірае тэмпы з такой імклівасцю, што газета, якая напачатку 1922 года каштавала ў Мінску 15, а ў правінцыі 10 рублёў, у снежні каштуе ўжо 1200 рублёў і вымушана шукаць сродкі на існаванне — пачынаючы цэлымі палосамі-прасцінамі друкаваць рэкламныя падборкі: прыватныя аб'явы зубных урачоў і анонсы распродажаў у крамах, інфармацыя пра правядзенне тых ці іншых таргоў і здачы ў арэнду, напрыклад, шэрагу беларускіх вадаёмаў ва ўсіх паветах...

За вялікімі тэмамі беларускія журналісты не забываліся і на мясцовыя, здавалася б, дробныя рэчы: паляпшэнне ўмоў утрымання пацыентаў псіхіятрычнай клінікі і выкараненне прастытуцыі, асветніцтва на сяле і арганізацыю кінаўпраўленнем Беларусі з гэтай мэтай 3 вясковых кінематографаў, недапушчальнасць бюракратыі і цяганіны — *«ведь смешно: заказные письма доходят из Америки в Россию за 10 дней, а бумажка от заведующего Муни к его районному коменданту идёт столько же...»*

Вас, мабыць, зачапіла загадкавае «Муні»? О, гэта асобны момант, на які варта звярнуць увагу: у 20-я гады многія савецкія газеты, у тым ліку і «Звезду», запаланілі грувасткія, часам проста жудасныя моўныя наватворы. Скажам, МУНІ — скарочаная назва Мінскага ўпраўлення нерухомай маёмасцю. А вось ці кожны здагадаецца, што стаіць за скарачэннямі «шкраб», «Белэвак», «Всемедикосантруд», «Заптамокруг», «Минцерабкоп», «Доброхим», «фабзавместком», «МОПР», «Охрматмлад»? Нават тагачасныя чытачы часта прасілі патлумачыць ім незразумелыя «советские словечки».

Нягледзячы на перагружанасць публікацый гэтымі наватворамі і патэтыкай, гартаць газету сярэдзіны 20-х досыць цікава: з 1923 года «Звезда» публікуе першыя інтэрв'ю, змяшчае палітычныя карыкатуры, а з 1924 года перыядычна друкуе фотаздымкі і выпускае асобным дадаткам сатырычна-гумарыстычны часопіс «Дубинка».

## НАША ЎСЁ

Тэма развіцця, выхавання, адукацыі дзяцей і моладзі знаходзілася ў «Звезды» на пастаянным кантролі. Так, у сярэдзіне 20-х газета шмат піша пра развіццё масавай выхаваўчай дзіцячай арганізацыі (да 1924 года яна насіла імя Спартака і толькі потым стала вядомай многім пакаленням савецкіх дзяцей ленінскай піянерыяй). У «Звезду» дасылаюць свае нататкі так званыя «спартакі-дзеткары», а пазней двойчы на месяц пачынае выходзіць адмысловы дзіцячы дадатак — газета «Юны будаўнік».

Мяркуючы па публікацыях, для журналістаў у гэтай сферы не было нязначных тэм. З аднолькавым імпэтам яны запісваюць інтэрв'ю з першым рэктарам БДУ, прафесарам Уладзімірам Пічэтам, які расказаў пра тыповую хваробу тагачасных універсітэтаў — *«это отсутствие экономистов и юристов, большей частью работающих в центральных учреждениях Москвы»*; абмяркоўваюць сістэму навучання ў беларускіх школах (*«наиболее соответствующей системой признана семилетка с техникумом над ней»*) і адзначаюць важнасць перавыхавання і сацыялізацыі «цяжкіх» падлеткаў: *«Минский институт социального перевоспитания и могилёвская колония для морально дефективных детей объединены в белорусский институт социального перевоспитания, который будет помещаться в совхозе «Крынки» Слуцкого округа. Институт рассчитан на 100-120 человек, будут организованы сапожные, портняжная, столярная и слесарно-кузнечная мастерские»*.


СЕГОДНЯ ПОДПИСКА НА ВСЕ ГАЗЕТЫ

будет приниматься с 11 ч. утра до 3-х час. дня

С 2-го Января 1923 года ОТКРЫВАЕТСЯ МАГАЗИН БЕЛШВЕЯ

Центральный союз Потребительных Обществ Белоруссии „ЦЕНТРОБЕЛСОЮЗ"

ПРЕДСТАВИТЕЛЬСТВА: ... Петрограде и Варшаве.

МИНСОРАБКОП (быв. ЕПО)

отпускает всякие товары по ценам ниже рыночных во всех своих магазинов:

1) Универсальный магазин

2) Бакалейно-колониальный

3) Кожевенно-обувный

4) Табачно-посудный

ХЛЕБОПРОДУКТ

ПЯТОЕ ГРУППОВОЕ УП...

Рэкламныя аб'явы ўжо ў 1920-х друкаваліся цэлымі палосамі.